# Праграма сустрэчы

## СЕРАДА 28 СНЕЖНЯ

Калі ласка, звяртайце ўвагу на інфармацыю адносна вашага прымаючага месца, транспартнага раскладу, а таксама раскладу малітваў ды іх месцаў у вашым “itinerarium” (буклеце ўдзельніка).

*Асаблівую ўвагу звярніце на расклад спецыяльных аўтобусаў і цягнікоў.*

Ранішнія малітвы адбываюцца ў мясцовых прымаючых пунктах.

Апоўдні кіруйцеся на выдачу пасілкаў. Усю інфармацыю наконт таго, як дабрацца ў горад, вы ўжо атрымалі.

### *Ад 17:30 да 18:15*

Раздача пасілкаў і спакаванага ланчу на наступны дзень у тым месцы, як тое пазначана ў вашым “itinerarium”. Не забудзьцеся прынесці торбачку, кубак ды лыжку.

### *19:00*

### СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце “itinerarium” (гід удзельніка)

**Спевы і струкутра малітвы размешчаныя прыканцы гэтага буклету**

Чытанне

*Пасля гэтых падзей было слова Госпада Абраму ў відзежы, і сказана: ня бойся, Абраме; Я твой шчыт; узнагарода твая даволі вялікая. Абрам сказаў: Валадару Госпадзе! што Ты дасі мне? я застаюся бяздзетны: распарадчык у доме гэтым Эліязэр з Дамаска. І сказаў Абрам: вось, Ты ня даў мне нашчадкаў, і вось гадунец мой спадчыннік мой. І было слова Госпада яму, і сказана: ня будзе ён тваім спадчыннікам; а той, хто пойдзе са сцёгнаў тваіх, будзе тваім спадчыннікам. І вывеў яго вонкі і сказаў: паглядзі на неба і палічы зоркі, калі ты можаш палічыць іх. І сказаў яму: столькі будзе ў цябе наступнікаў. Абрам паверыў Госпаду, і Ён залічыў яму гэта ў праведнасць.*

*(Быцця 15, 1-6)*

Пад час другое часткі малітвы:

**разважанне Брата Алоіса (выдрукаваныя тэксты даступныя пры ўваходзе да месцаў малітвы), пасля чаго малітва вакол крыжа.**

Пасля вяртайцеся да месцаў засялення, і, калі ласка, не вяртайцеся запозна, каб не турбаваць вашых гаспадароў.

Дакладна прытрымлівайцеся падказак наконт транспарту, што вы атрымалі.

# ЧАЦВЕР 29 СНЕЖНЯ

***8:30***

**Ранішняя малітва ў прымаючых пунктах**

Спеў: *The kingdom of God (14)*

з Псальму 105
1. Слаўце Госпада; заклікайце імя Ягонае; абвяшчайце ў народах дзеі Ягоныя.
2. Спявайце Яму і грайце Яму; раскажыце пра ўсе цуды Ягоныя.
3. Шукайце Госпада і сілы Ягонай, шукайце аблічча Ягонага заўсёды.
4. Вы, семя Абрахамавае, рабы Ягоныя, выбранцы Ягоныя, згадвайце цуды Ягоныя, якія ўчыніў.
5. Вечна Ён памятае Свой запавет, слова, якое запавядаў тысячам родаў.

Чытанне

*А жадаем, каб кожны з вас, дзеля поўнай пэўнасці ў надзеі, выяўляў такую самую руплівасць да канца; каб вы не разгультаіліся, а пераймалі тых, якія вераю і доўгай цярплівасцю спадкуюць абяцанні. Бог, даючы абяцанне Абрахаму, калі ня мог нікім вышэйшым прысягнуць, прысягаў Самім Сабою, кажучы: «у ісціне дабраслаўляючы, дабраслаўляю цябе і памнажаючы памножу цябе». І так Абрахам цярплівасцю атрымаў абяцанае.*

*(да Габрэяў 6, 11-15)*

Спеў: *Pateicieties Tam Kungam (Confitemini Domino) (22)*

Цішыня

Малітва: Богу жывы, хаця убогая нашая малітва, мы шукаем Цябе з упэўненасцю. І Твая любоў прабівае шлях наперад праз нашыя роздумы і нават праз нашыя сумневы.

Малітва верных
1. Божа, наш Ойча, ты прагнеш, каб мы былі новым стварэннем у Хрысце. Молімся да Цябе.
2. Пане, Ты абяцаеш нам новае неба і новую зямлю. Аднаві нашую надзею.
3. Ты вызваліў нас з нашае няволі, даючы нам свайго адзінага Сына; Ты адкрыў нам шлях да свабоды.

4. Учыні, каб мы слухалі Тваё Слова і віталі яго сэрцам, напоўненым любоўю.
5. Ты перанёс нас са смерці да жыцця, і даў нам новы подых у Духу: падаруй нам зноў чыстыя сэрцы.

Ойча наш

Спевы

**Знаёмства з мясцовымі суполкамі і сустрэчы ў малых групах дзялення:**

***Моцна трываць у надзеі; гэта творчасць***

Калі малыя групы складзены, пазнайце адзін адно. Затым прачытайце тэкст з Бібліі з учарашняе вечаровае і сённяшняе малітваў (Быцця 15, 1-6 і Габрэяў 6, 11-15). Паразмаўляйце на гэты конт, дзелячыся вашымі думкамі наконт наступных пытанняў:

- Якія клопаты і надзеі турбавалі/займалі мяне апошнім часам?
  *What worries and hopes have (pre)occupied me recently?*
- Які ўрывак з Бібліі дапамог мне ці надаль дапамагае верыць абяцанням Бога?
  *What Bible texts have helped me or continue to help me trust in God's promises?*
- Першая прапанова на 2017 год: Надзея – гэта “не паспешны аптымізм, які закрывае вочы на рэальнасць”. Да чаго запрашаюць мяне гэтыя словы?
  *First Proposal 2017: Hope “is not a facile optimism that shuts its eyes to reality.” To what can these words invite me?*

***Ад 12:30***

Выдача гарбаты ў месцы, пазначаным у вашым “itinerarium”.

*13:15*

## СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце “itinerarium”.

Чытанне

*Прыносілі да Яго таксама немаўлят, каб Ён дакрануўся да іх. Але вучні, убачыўшы, забаранялі ім. Тады Езус паклікаў іх да сябе і сказаў: «Дазвольце дзецям прыходзіць да Мяне і не забараняйце ім, бо такім належыць Валадарства Божае. Сапраўды кажу вам: хто не прыме Валадарства Божага, як дзіця, той не ўвойдзе ў яго».*

*(Лукі 18, 15-17)*

Пасля малітвы адбываецца кароткае разважанее аднаго з братоў Тэзэ:

***Проста давяраць***

*15:00*

### Варштаты

Следуйце падказкам адпаведна кожнае тэматыцы. Паўсюль будзе ангельская і латышская мовы. Калі вам будзе патрэбны пераклад на нейкую іншую мову, калі ласка, не саромейцеся запытацца валанцёраў. Амаль усе варштаты будуць у цэнтры горада, таму найхутчэй перасоўвацца будзе пешшу.

## *ДУХОЎНАСЦЬ*

**Час на асабістую малітву і тое, каб быць выслуханым.**
**Магчымасць сакрамэнту споведзі.**
Rīgas Sāpju Dievmātes draudze, код MC04, Pils iela 5
*Трамваі 5, 6, 7, 9 / Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак : Nacionālais teātris + 8 хвілінаў пешшу ;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак : Zigfrīda Annas Meierovica bulvāris + 8 хвілінаў пешшу*

**Проста пачніце зноў. Няўдачы, пертварэнні і сціпласць дзяцей.**
**Біблійнае разважанне з братам з Тэзэ.**
Ķīpsala, Hall 1, код EM10, Ķīpsalas iela 8
*Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 –*
*Прыпынак: Ķīpsala альбо Preses nams*

**Матушка Марыя Скабцова (1891-1945), праваслаўная святая на сёння.**
**Праводзіць брат з Тэзэ.**
Rīgas Sv. Marijas Magdalēnas draudze, код MC10, Klostera iela 2
*Трамваі 5, 6, 7, 9 / Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак: Nacionālais teātris + 8 хвілінаў пешшу;*
*Аўтобус 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбус 5, 12, 25 –*
*Прыпынак: Zigfrīda Annas Meierovica bulvāris + 8 хвілінаў пешшу*

**“Моманты з жыцця Брата Ражэ”. Фільм шаснаццаці момантаў з жыцця засноўніка Супольнасці Тэзэ, ад ягонага дзяцінства да драматычнае смерці (90 хв.)**
Kinoteātris “K.Suns”, код CM11, Elizabetes iela 83/85
*Трамваі 3, 6, 11 / Аўтобусы 1, 2, 11, 14, 16, 21, 24, 40 / Тралейбусы 3, 17, 19, 24 –*
*Прыпынак: Merķeļa iela + 5 хвілінаў пешшу*

## *ЦАРКВА*

**“Прыгажосць нябёсаў на зямлі”: наведванне Рыжскага праваслаўнага Сабору Раства Хрыстова, з ягонымі іконамі і літургічным спевам.**
Rīgas Kristus piedzimšanas pareizticīgo katedrāle, код CM06, Brīvības bulvāris 23
*Аўтобусы 3, 20, 21, 37, 41, 53 / Тралейбусы 14, 17 –*
*Прыпынак: Esplanāde (кірунак - цэнтр) ;*
*Аўтобусы 1, 14, 16, 21, 40 / Тралейбусы 1, 12, 14, 17 –*
*Прыпынак: Tērbatas iela (кірунак адваротны цэнтру)*

**Маленькія часовыя супольнасці:**
**перабыванне разам па-суседстве месяц часу з трыма ці чатырма іншымі асобамі, каб дзяліцца сваім жыццём, малітваю і браць удзел у чынах салідарнасці.**
Ķīpsala Conference Room 3
*Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 –*
*Прыпынкі: Ķīpsala альбо Preses nams*

***17:00*** **Пілігрымка да Егіпту і наведванне Каптыйскае Царквы (26 верасня-1 кастрычніка 2017). Інфармацыйная сустрэча.**
*Увага: пачатак а 17:00!!*
Ķīpsala Conference Room 3
*Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 –*
*Прыпынкі: Ķīpsala альбо Preses nams*

## *САЛІДАРНАСЦЬ / ГРАМАДСТВА*

**Еўропа сёння: што мы можам рабіць для еднасці кантыненту? Сустрэчы з некалькімі асобамі з розных дзяржаў, што працуюць на будаванне Еўропы.**
Latvijas Nacionālā bibliotēka, код DM01, Mūkusalas iela 3
*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32, 35, 38, 39, 43, 54, 55 / Тралейбусы 9, 27 – Прыпынак: Nacionala biblioteka*

**Прымаючы мігрантаў і бежанцаў:**
**людзі, што прапануюць гасціннасць, падзеляцца сваім дасвядчэннем.**
Rīgas Dome, код MM09, Rātslaukums 1
*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32 / Тралейбусы 9, 27 – Прыпынак: 11. novembra krastmala (кірунак - цэнтр) альбо 13. janvāra iela (кірунак адваротны цэнтру) + 5 хвілінаў пешшу*

**Разам да лепшае інтэграцыі ўсіх у грамадстве:**
**сустрэча з былымі бяздомнымі і былымі вязнямі.**
St. Saviour's Church, код MR01, Anglikanu iela 2a
*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32 / Тралейбусы 9, 27 – Прыпынак: 11. novembra krastmala (кірунак - цэнтр) альбо 13. janvāra iela (кірунак адваротны цэнтру) + 5 хвілінаў пешшу*

## *КУЛЬТУРА І ВЕРА*

**200 гадоў скарбам мастацтва:**
**наведванне Нацыянальнае Латвійскае Мастацкае Галерэі.**
*Колькасць месцаў абмежаваная. Квіткі раздаюцца ў інфармацыйных пунктах увечары 28-га і да 14:00 29-га снежня.*
Latvijas Nacionālais mākslas muzejs, код DM02, K. Valdemāra iela 10
*Аўтобусы 11, 37, 41, 53 / Тралейбусы 3, 5, 25 – Прыпынак: Mākslas muzejs*

**Святкуючы Хануку, урачыстасць святла, разам з габрэйскае абшчынаю Рыгі. Спевы і танцы.**
*Колькасць месцаў абмежаваная. Квіткі раздаюцца ў інфармацыйных пунктах увечары 28-га і да 14:00 29-га снежня.*
Музей "Габрэі ў Латвіі", код DM03, Skolas iela 6
*Аўтобусы 11, 37, 41, 53 / Тралейбусы 3, 5, 25 – Прыпынак: Mākslas muzejs + 5 хвілінаў пешшу*

**Канцэрт класічнае музыкі:**
**маладыя латышы граюць Баха, Форэ, Дубра, Праўліньша…**
Rīgas Sv. Jāņa ev. lut. draudze, код ML16, Skārņu iela 24
*Трамваі 5, 6, 7, 9 – Прыпынак: Nacionālā opera + 5 хвілінаў пешшу;*
*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32, 35, 38, 39, 43, 54, 55 / Тралейбусы 9, 27 – Прыпынак: 13. janvāra iela + 5 хвілінаў пешшу*

**Шлях да свабоды – латвійская барацьба пад час савецкае акупацыі. Асабістыя гісторыі і наведванне мясцінаў на Бульвары Свабоды.**
Rīgas Doma ev. lut. draudze, код ML07, Doma laukums 1
*Трамваі 5, 6, 7, 9 – Прыпынак: Nacionālā opera + 5 хвілінаў пешшу;*
*Трамваі 3, 6 – Прыпынак: Aspazijas bulvāris + 5 хвілінаў пешшу*

**Галасы Латвіі: розныя латышскія гурты запрашаюць паслухаць і узяць удзел у хоравым выкананні.**
Rīgas Sv. Pētera ev. lut. draudze, код ML19, Skārņu iela 19
*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32 / Тралейбусы 9, 27 – Прыпынак: 11. novembra krastmala (кірунак - цэнтр) альбо 13. janvāra iela (кірунак адваротны цэнтру) + 5 хвілінаў пешшу*

## *Ад 17:30 да 18:00*

Раздача пасілкаў і спакаваных ланчаў на наступны дзень у месцы, пазначаным у вашым “itinerarium”.

*19:00*

## СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце “itinerarium”.

Чытанне

*І вось, да Яго падышоў адзін чалавек і сказаў: «Настаўнік, што добрага зрабіць мне, каб мець жыццё вечнае?» Ён адказаў яму: «Чаму пытаешся ў мяне пра дабро? Адзін ёсць Добры! Калі хочаш увайсці ў жыццё, захоўвай запаведзі». Той спытаўся ў Яго: «Якія?» Езус адказаў: «Не забівай, не чужалож, не крадзі, не сведчы фальшыва, шануй бацьку і маці, любі бліжняга свайго, як самога сябе». Юнак сказаў Яму: «Усё гэта я захоўваў, чаго яшчэ нестае мне?» Езус адказаў яму: «Калі хочаш быць дасканалым, ідзі, прадай маёмасць сваю і раздай убогім, і будзеш мець скарб у нябёсах; пасля прыходзь і ідзі за Мною». Пачуўшы сказанае, юнак адышоў маркотны, бо меў вялікую маёмасць.*

*(Мацвея 19, 16-22)*

Пад час другое часткі малітвы:

**разважанне Брата Алоіса, пасля чаго малітва вакол крыжа.**

# ПЯТНІЦА 30 СНЕЖНЯ

***8:30***

**Ранішняя малітва ў прымаючых пунктах**

Спеў: *Kungam pateicos (Bless the Lord) (5)*

з Псальму 23
1. Гасподзь — Пастыр мой; я ніякай нястачы ня мецьму.
2. Ён пасвіць мяне на пашах зялёных, на ціхія воды водзіць мяне.
3. Ён душу маю мацуе, кіруе мяне на сцежкі праўды.
4. Так, ласка і любоў хай будуць са мною ва ўсе дні жыцця майго.
5. Пане, і я буду ў доме Тваім многія дні.

Чытанне

*Езус сказаў: Прыйдзіце да Мяне, усе спрацаваныя і абцяжараныя, і Я супакою вас. Вазьміце ярмо Маё на сябе і навучыцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам, і знойдзеце спакой для сваіх душаў. Бо ярмо Маё прыемнае, і цяжар Мой лёгкі».*

*(Мацвея 11, 28-30)*

Спеў: *Bóg jest miłoscią (6)*

Цішыня

Малітва: Езу, святло нашых сэрцаў, ад часу Твайго паўстання з памёрлых, ты ніколі не перастаеш прыходзіць да нас. Дзе б мы ні былі, Ты заўсёды чакаеш нас. І Ты кажаш нам: прыйдзіце да мяне тыя, хто абцяжараныя, і будзеце пацешаныя.

Малітва верных
1. Езу Хрыстэ, Ты прыходзіш перамяніць нас і аднавіць перад абліччам Бога: сваці ў нашае цемры.
2. Езу Хрыстэ, святло нашых сэрцаў, Ты ведаеш нашае прагненне: вядзі нас да крыніцаў Твайго Евангелля.
3. Езу Хрыстэ, святло свету, Ты свеціш для кожнае чалавечае істоты: дазволь убачыць Тваю прысутнасць у кожным чалавеку.
4. Езу Хрыстэ, сябра бедных: адкрый у нас брамы сціпласці так, каб мы маглі прывітаць Цябе.
5. Езу Хрыстэ, ціхі і пакорны сэрцам: аднаві ў нас дух дзяцінства.

Ойча наш

Спевы

## Сустрэчы па малых групах:

***Спрасціць нашае жыццё, каб дзяліцца гэтым***

Прачытайце ўрыўкі з Бібліі з учарашняе вечаровае і сённяшняе ранішняе малітвы (Мацвея 19, 16-22 ды 11, 28-30), а таксама другую Прапанову на 2017 год. Пасля паразмаўляйце, так, як учора.

- Што падтрымлівае мяне ў маёй адкрытасці ў адносінах да Бога і да іншых? Як я магу спрасціць сваё жыццё?
  *What holds me back in my openness to God and to others? How can I simplify my life?*
- Езус прапануе “лёгкі цяжар”. Ад чаго Ён хоча вызваліць мяне?? Што ён просіць мяне зрабіць?
  *Jesus offers a “light burden”. From what does he want to set me free? What is he asking me to undertake ?*
- Акты абмену, сацыяльных або экалагічных абавязацельстваў ... Што можа зрабіць кожны чалавек?
  *Acts of sharing, social or environmental commitments... What can each person do?*

### *Ад 12:30*

Выдача гарбаты ў месцы, пазначаным у вашым “itinerarium”.

*13:15*

## СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце “itinerarium”.

Чытанне

*Павел напісаў: Розныя ёсць дары, але той самы Дух. Розныя ёсць служэнні, але той самы Пан. Розныя ёсць дзеянні, але той самы Бог, які робіць усё ва ўсіх. Аднак кожнаму даецца праяўленне Духа на карысць. Аднаму даецца Духам слова мудрасці, другому – слова пазнання паводле таго самага Духа; іншаму – вера ў тым самым Духу; іншаму – дар аздараўлення ў тым жа Духу; іншаму – моц чыніць цуды, іншаму – прароцтва, іншаму – распазнаванне духаў, іншаму – розныя мовы, іншаму – тлумачэнне моваў. А ўсё гэта здзяйсняе адзін і той жа Дух, які ўдзяляе кожнаму паасобку, як жадае.*

*(1 Карынцянаў 12, 4-11)*

Пасля малітвы адбываецца кароткае разважанне аднаго з братоў Тэзэ:

***Ісці разам, каб дазволіць рэалізавацца дынамізму Евангелля***

*15:00*

### Варштаты

Следуйце падказкам адпаведна кожнае тэматыцы. Паўсюль будзе ангельская і латышская мовы. Калі вам будзе патрэбны пераклад на нейкую іншую мову, калі ласка, не саромейцеся запытацца валанцёраў. Амаль усе варштаты будуць у цэнтры горада, таму найхутчэй перасоўвацца будзе пешшу.

## *ДУХОЎНАСЦЬ*

**Час на асабістую малітву і тое, каб быць выслуханым.**
**Магчымасць сакрамэнту споведзі.**
Rīgas Sāpju Dievmātes draudze, код MC04, Pils iela 5
*Трамваі 5, 6, 7, 9 / Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак : Nacionālais teātris + 8 хвілінаў пешшу ;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак : Zigfrīda Annas Meierovica bulvāris + 8 хвілінаў пешшу*

**Проста пачніце зноў. Няўдачы, ператварэнні і сціпласць дзяцей.**
**Біблійнае разважанне з братам з Тэзэ.**
Rīgas Sv. Jēkaba katedrāle, код MC09, Jēkaba iela 9
*Трамваі 5, 6, 7, 9 / Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак: Nacionālais teātris + 8 хвілінаў пешшу;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак: Zigfrīda Annas Meierovica bulvāris + 8 хвілінаў пешшу*

**Матушка Марыя Скабцова (1891-1945), праваслаўная святая на сёння.**
**Праводзіць брат з Тэзэ.**
Rīgas Sv. Marijas Magdalēnas draudze, код MC10, Klostera iela 2
*Трамваі 5, 6, 7, 9 / Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак: Nacionālais teātris + 8 хвілінаў пешшу;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 12, 25 –*
*Прыпынак: Zigfrīda Annas Meierovica bulvāris + 8 хвілінаў пешшу*

**“Моманты з жыцця Брата Ражэ”. Фільм шаснаццаці момантаў з жыцця засноўніка Супольнасці Тэзэ, ад ягонага дзяцінства да драматычнае смерці (90 хв.)**
Kinoteātris “K.Suns”, код CM11, Elizabetes iela 83/85
*Трамваі 3, 6, 11 / Аўтобусы 1, 2, 11, 14, 16, 21, 24, 40 / Тралейбусы 3, 17, 19, 24 –*
*Прыпынак: Merķeļa iela + 5 хвілінаў пешшу*

**Жыць вераю як прафесіяналы: сустрэча з суддзёю, адвакатам, журналісткаю, доктарам і прафесарам універсітэту.**
Rīgas Sv. Jāņa ev. lut. draudze, код ML16, Skārņu iela 24
*Трамваі 5, 6, 7, 9 – Прыпынак: Nacionālā opera + 5 хвілінаў пешшу;*
*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32, 35, 38, 39, 43, 54, 55 / Тралейбусы 9, 27 – Прыпынак: 13. janvāra iela + 5 хвілінаў пешшу*

## *ЦАРКВА*

**“Прыгажосць нябёсаў на зямлі”: наведванне Рыжскага праваслаўнага Сабору Раства Хрыстова, з ягонымі іконамі і літургічным спевам.**
Rīgas Kristus piedzimšanas pareizticīgo katedrāle, код CM06, Brīvības bulvāris 23
*Аўтобусы 3, 20, 21, 37, 41, 53 / Тралейбусы 14, 17 –*
*Прыпынак: Esplanāde (кірунак - цэнтр) ;*
*Аўтобусы 1, 14, 16, 21, 40 / Тралейбусы 1, 12, 14, 17 –*
*Прыпынак: Tērbatas iela (кірунак адваротны цэнтру)*

**Маленькія часовыя супольнасці:**
**перабыванне разам па-суседстве месяц часу з трыма ці чатырма іншымі асобамі, каб дзяліцца сваім жыццём, малітваю і браць удзел у чынах салідарнасці.**
Ķīpsala Conference Room 3

*Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 –*
*Прыпынкі: Ķīpsala альбо Preses nams*

**<u>*17:00*</u> Пілігрымка да Егіпту і наведванне Каптыйскае Царквы**
**(26 верасня-1 кастрычніка 2017). Інфармацыйная сустрэча.**
*Увага: пачатак а 17:00!!*
Ķīpsala Conference Room 3

*Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 –*
*Прыпынкі: Ķīpsala альбо Preses nams*

## *САЛІДАРНАСЦЬ / ГРАМАДСТВА*

**Што мы можам зрабіць для нашага супольнага дому – зямлі?**
**Разважанні над актуальнымі праблемамі навакольнага асяроддзя на падставе энцыклікі Laudato si' папы Францішка.**
Rīgas Dome, код MM09, Rātslaukums 1

*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32 / Тралейбусы 9, 27 –*
*Прыпынак: 11. novembra krastmala (кірунак - цэнтр) альбо*
*13. janvāra iela (кірунак адваротны цэнтру) + 5 хвілінаў пешшу*

**Якім чынам можна пазбыцца шкодных звычак? Як выглядае шлях вызвалення?**
**Асабістыя гісторыі і разважанні.**
St. Saviour's Church, код MR01, Anglikanu iela 2a

*Трамваі 2, 4, 5, 10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32 / Тралейбусы 9, 27 –*
*Прыпынак: 11. novembra krastmala (кірунак - цэнтр) альбо*
*13. janvāra iela (кірунак адваротны цэнтру) + 5 хвілінаў пешшу*

## *КУЛЬТУРА І ВЕРА*

**200 гадоў скарбам мастацтва:**
**наведванне Нацыянальнае Латвійскае Галерэі Мастацтва.**
*Колькасць месцаў абмежаваная. Квіткі раздаюцца ў інфармацыйных пунктах увечары 29-га і да 14:00 30-га снежня.*
Latvijas Nacionālais mākslas muzejs, код DM02, K. Valdemāra iela 10

*Аўтобусы 11, 37, 41, 53 / Тралейбусы 3, 5, 25 – Прыпынак: Mākslas muzejs*

**Дзе ў сучасным мастацтве Бог? Размова з маладымі латышскімі мастакамі.**
Rīgas Vecā Sv. Ģertrūdes draudze, код BL21, Ģertrūdes iela 8
*Аўтобусы 1, 3, 6, 9, 14, 16, 21, 40, 50 / Тралейбусы 12, 14, 17 – Прыпынак: Ģertrūdes iela*

**Сатварэнне Богам вачыма навукоўца. Сустрэча з праф. Вячэслаўсам Кашчэеўсам, спецыялістам з галіны квантавае фізікі і нанатэхналогіі, Латвійскі Ўніверсітэт.**
Latvijas Nacionālā bibliotēka, код DM01, Mūkusalas iela 3
*Трамваі 2,4,5,10 / Аўтобусы 3, 4, 4z, 7, 8, 10, 21, 22, 23, 25, 26, 32, 35, 38, 39, 43, 54, 55 / Тралейбусы: 9, 27 – Прыпынак: Nacionala biblioteka*

**Латвія і ейныя нацыянальныя музыка, танцы, "кокле" (старажытны інструмент).**
Ķīpsala, Hall 1, код EM10, Ķīpsalas iela 8
*Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;*
*Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 – Прыпынак: Ķīpsala ои Preses nams*

## *Ад 17:30 да 18:00*

Раздача пасілкаў і спакаваных ланчаў на наступны дзень у месцы, пазначаным у вашым "itinerarium".

*19:00*

## СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА

**з літургіяй святла**

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце “itinerarium”.

Чытанне

*І трывалі яны ў вучэнні Апосталаў і ў супольнасці, у ламанні хлеба і ў малітвах. І быў страх у кожнай душы; шмат цудаў і знакаў чынілі Апосталы. Усе ж вернікі былі разам, і ўсё ў іх было супольнае; і прадавалі набытак свой і маёмасць, і дзялілі паміж усімі, хто меў патрэбу. Штодня збіраліся аднадушна ў святыні, і ламаючы дома хлеб, яны спажывалі ежу ў радасці і прастаце сэрца, праслаўляючы Бога і маючы прыхільнасць усяго народу. А Пан штодня далучаў да іх тых, хто меў быць збаўлены.*

*(Дзеі Апосталаў 2, 42-47)*

Пад час другое часткі малітвы:

**разважанне Брата Алоіса, пасля чаго малітва вакол крыжа**.

# СУБОТА 31 СНЕЖНЯ

***8:30***

**Ранішняя малітва ў прымаючых пунктах**

Спеў: *Svētīta Tauta (1)*

з Псальму 31
1. У Твае рукі аддаю дух мой; Ты выбаўляў мяне, Госпадзе, Божа праўды.
2. А я на Цябе, Госпадзе, спадзяюся; я кажу: Ты мой Бог.
3. Як многа ў Цябе дабротаў, якія Ты прыхаваў тым, што на Цябе спадзяюцца!
4. Любіце Госпада, усе праведнікі Ягоныя; Гасподзь ахоўвае верных.
5. Будзьце мужныя, і хай мацуецца сэрца вашае, усе, хто надзею на Госпада мае!

Чытанне

*Бо належала, каб Той, дзеля Каго ўсё і праз Каго ўсё, многіх сыноў вядучы да славы, Пачынальніка выратавання іх зрабіў праз цярпенні. Бо, і Той, Хто асвячае, і каго асвячаюць, усе — ад Адзінага; таму ён не саромеецца называць іх братамі і сёстрамі, кажучы: «абвяшчу Тваё імя братам і сёстрам Маім, сярод супольнасці апяю Цябе». І яшчэ: «Я буду спадзявацца на Яго». І яшчэ: «вось, Я і дзеці, якіх даў Мне Бог».*

*(да Габрэяў 2, 10-13)*

Спеў: *Il Signore ti ristora (20)*

Цішыня

Малітва: Богу жывы, мы молімся за шматлікіх жанчын, мужчын, моладзь і дзяцей, што, перасякаючы зямлю, імкнуцца быць сведкамі супакою, даверу і прабачэння.

Малітва верных
1. За ўсіх тых, хто шчыра вызнае Цябе, Пане. Цябе просім.
2. Дазволь нам распазнаць Тваю прысутнасць у тых, хто поруч з намі; зрабі нас уражлівымі на галечу і няшчасце.
3. Пане, мы молімся за тых, хто церпіць на месцы працы і хто яе не мае, каб іх годнасць была паважаная.
4. За вязняў і тых, пра каго забылася грамадства, учыні нас салідарнымі ў іх цярпенні, Крыніца суцяшэння, Цябе просім.
5. Каб у Тваёй Царкве мы былі знакамі ўзаемнае любові, Цябе просім.

Ойча наш

Спевы

**Сустрэча па малых групах:**

***Дазволіць узрастаць сяброўству дзеля прыгатавання супакою***

Прачытайце ўрыўкі з учарашняе вечаровае і сённяшняе ранішняе малітваў (Дзеі 2, 42-47 ды Габрэяў 2, 10-13), а таксама чацвёртую прапанову на 2017 год. Паразважайце разам над наступнымі пытаннямі:

- "Езус не саромеецца называць нас братамі і сёстрамі". (Габрэяў 2, 11). Да чаго натхняюць мяне гэтыя словы? Што з гэтага выцякае?
  *"Jesus is not ashamed to call us his brothers and sisters." (Hebrews 2:11). What do these words inspire in me ? What attitude(s) flow(s) from them?*
- Якую ролю адыгрывае хрысціянская абшчына – узгадка ў тэксце апошняга вечара – у маім жыцці? Якую ролю адыгрывае унутраны свет, згаданы ў чацвёртае прапанове, у маім жыцці?
  *What role does the Christian community, mentioned in last evening's text, play in my life? What role does inner peace, mentioned in the fourth proposal, play in my life ?*
- Якія канкрэтныя чыны можа здзейсніць чалавек, каб выйсці да тых, што адрозніваюцца, і будаваць масты?
  *What concrete acts can each person accomplish to go towards those who are different and to build bridges?*

***Ад 12:30***

Выдача гарбаты ў месцы, пазначаным у вашым "itinerarium".

***13:15***

## СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце "itinerarium".

Чытанне

*Калі Ён прамаўляў да людзей, Маці і браты Ягоныя стаялі звонку і хацелі пагаварыць з Ім. І нехта сказаў Яму: «Вось Маці Твая і браты Твае стаяць звонку і хочуць пагаварыць з Табою». А Ён адказаў таму, хто звярнуўся да Яго: «Хто маці Мая і хто браты Мае?» І, працягнуўшы руку сваю да вучняў сваіх, сказаў: «Вось Маці Мая і браты Мае. Бо хто выконвае волю Айца Майго, які ў нябёсах, той Мне брат, і сястра, і маці».*

*(Мацвея 12, 46-50)*

Кароткае разважанне аднаго з братоў Тэзэ прыканцы малітвы:

***Чалавечая салідарнасць***

***15:00***

**Рэгіянальныя сустрэчы паводле краін**

Гэтыя сустрэчы, што праводзяцца братамі з Тэзэ, скіраваныя на тое, каб дапамагчы табе знайсці шляхі, каб працягваць Пілігрымку Даверу па вяртанні дадому.

- Беларусь
  *Ķīpsala conference room 3*

Ķīpsalas iela 8 (EM10 на гарадской мапе)
Аўтобус 57 – Прыпынак: Kaiju iela;
Аўтобусы 13, 30, 37, 41, 53, 57 / Тралейбусы 5, 9, 12, 25 –
Прыпынкі: Ķīpsala альбо Preses nams

***Ад 17:30 да 18:00***

Раздача пасілкаў у месцы, пазначаным у вашым “itinerarium”.

***19:00***

**СУПОЛЬНАЯ МАЛІТВА**

Каб даведацца месца, калі ласка, праверце “itinerarium”.

Чытанне

*Езус сказаў: Усё, што дае Мне Айцец, да Мяне прыйдзе, і таго, хто прыходзіць да Мяне, Я не адкіну, бо Я сыйшоў з неба не для таго, каб чыніць сваю волю, але волю таго, хто Мяне паслаў. А воля таго, хто паслаў Мяне, такая, каб з усяго, што Ён даў Мне, Я нічога не страціў, але каб уваскрасіў у апошні дзень. Бо такая воля Айца Майго, каб кожны, хто бачыць Сына і верыць у Яго, меў жыццё вечнае. І Я ўваскрашу яго ў апошні дзень.*

*(Яна 6, 37-40)*

Пад час другое часткі малітвы:

**разважанне Брата Алоіса, пасля чаго малітва вакол крыжа.**

Увечары 31 снежня грамадскі транспарт у Рызе ды наваколлі будзе вельмі абмежаваны. Зазірніце ў вашыя “itinerarium”, каб праверыць, ці ёсць нейкія асаблівыя падказкі наконт транспарту на гэты вечар.

### *23:00*

**У прымаючых пунктах у еднасці з тымі, хто пакутуе, адбываецца малітоўнае чуванне ў інтэнцыі супакою, а пасля адбываецца “свята народаў”:**

Спевы: *Venite, exultemus Domino (4)* і *Jēzu, mans Kungs (Jésus le Christ) (10)*

Уступная малітва: Божа супакою, мы павяраем Табе тых, хто не бачыць будучыні, хто не мае надзеі. Твой Святы Дух робіць нашую малітву больш палкаю, і мы прагнем спаглядаць за тымі, хто не бачыць дарогі наперад. Нашаю малітваю мы рыхтуем шлях Твайго прыйсця.

Спеў: *In manus tuas, Pater (19)*

з Псальму 84
1. Якія жаданыя селішчы Твае, Госпадзе Ўсемагутны! Сэрца маё і цела маё імкнуцца да Бога жывога.
2. І птушка знаходзіць сабе жытло, і ластаўка гняздо сабе, дзе пакласці птушанятак сваіх, каля алтароў Тваіх, Госпадзе Ўсемагутны, Цару мой і Божа мой!
3. Будуць шчаслівыя тыя, што жывуць у доме Тваім; яны няспынна будуць славіць Цябе.
4. Бо адзін дзень у дварах Тваіх лепшы за тысячу.
5. Госпадзе Ўсемагутны! Будзе шчаслівы той чалавек, які на Цябе спадзяецца!

Чытанне

*Езус сказаў: Няхай не трывожыцца сэрца вашае. Верыце ў Бога і ў Мяне верце. У доме Айца Майго шмат святліц. А калі б так не было, ці сказаў бы вам, што іду падрыхтаваць месца для вас. І калі пайду і падрыхтую вам месца, прыйду зноў і забяру вас да сябе, каб і вы былі там, дзе Я. А дарогу, куды Я іду, вы ведаеце». Кажа яму Тамаш: «Пане, не ведаем, куды ідзеш. Як жа можам ведаць дарогу?» Езус сказаў яму: «Я — дарога, і праўда, і жыццё».*

*(Яна 14:1-6а)*

Спеў: *Behüte mich, Gott (12)*

Цішыня

Малітва верных
1. Уваскрослы Хрыстус, Ты ведаеш нашае імкненне: вядзі нас шляхам да вечнасці.
2. Уваскрослы Хрыстус, мы молімся за тых, якія не могуць увераваць: яны могуць заўсёды скарыстацца з Твёй любові.
3. Уваскрослы Хрыстус, Ты падтрымліваеш тых, хто сутыкаецца з цяжкасцямі і адчаем: вядзі нас шляхам да вечнасці.
4. Уваскрослы Хрыстус, молімся за тых, што сталі ахвярамі гвалту і прыніжэння: прыйдзі, каб загоіць іх раны.

5. Уваскрослы Хрыстус, Твой Святы Дух вядзе нас: з’яднай усе народы ў Тваім Валадарстве.

Ойча наш

Спеў: *Славіте всі народи (Laudate omnes gentes) (7)*

Малітва: Уваскрослы Езус, Ты даеш нам Твайго Святога Духа. І мы прагнем сказаць Табе: Ты маеш словы, што даюць жыццё нашае душы; да каго яшчэ мы можам пайсці, Уваскрослы Пане?

Спевы

# НЯДЗЕЛЯ 1 СТУДЗЕНЯ

### Набажэнствы і службы ў прымаючых пунктах

*Месца і час набажэнстваў канфесій, што адрозніваюцца ад вашага прымаючага пункту, можна даведацца ў інфармацыйным пункце.*

*Некаторыя альбо ўсе ніжэйшыя элементы могуць быць выкарыстаныя ў часе ранішняе цэлебрацыі ў парафіі:*

з Псальму 67
1. Божа, злітуйся і дабраславі нам, і няхай святло Аблічча Твайго пральецца на нас.
2. Праз гэта будуць спазнаныя шляхі Твае на зямлі і ўсе народы даведаюцца пра Тваю дапамогу.
3. Няхай усе народы моляцца, Пане; няхай усе народы моляцца да Цябе!
4. Няхай народы цешацца і чакаюць на Тваё справядлівае панаванне ў свеце; Ты вядзеш народы зямлі.
5. Зямля дала свой плён, каб Бог, наш Бог, дабраславіў нам. Няхай Бог дае нам яшчэ дабраславенняў, каб народы на краю свету прызналі Ягоную моц.

Чытанне

*Калі анёлы адышлі ад іх на неба, пастухі сказалі адзін аднаму: «Пойдзем у Бэтлеем і паглядзім, што там сталася і пра што абвясціў нам Пан». І пайшлі яны, спяшаючыся, і знайшлі Марыю і Юзафа, і Немаўля, якое ляжала ў яслях. А калі ўбачылі, расказалі тое, што было абвешчана ім пра гэтае Дзіця. Усе, хто чуў, дзівіліся таму, што расказвалі ім пастухі. А Марыя захоўвала ўсе гэтыя словы, разважаючы ў сэрцы сваім. І вярнуліся пастухі, праслаўляючы і хвалячы Бога за ўсё, што пачулі і ўбачылі, як было сказана ім. Калі мінула восем дзён, каб абрэзаць Дзіця, далі Яму імя Езус, якое было названа анёлам перад Яго зачаццем ва ўлонні.*

*(Лукі 2, 15-21)*

Малітва верных
1. За супакой на свеце і вольнасць для ўсіх людзей, Цябе просім.
2. Каб лідары Цэркваў нястомна дамагаліся бачнага адзінства паміж хрысціянамі, Цябе просім.
3. За чэснасць у палітычным жыцці, за справядлівасць у грамадстве, Цябе просім.
4. За тых, хто працуе з беднымі, замежнікамі і выключанымі, Цябе просім.

**Праваслаўныя літургіі**

- 7:00 і 9:00: Kristus dzimšanas katedrāle
  *Brīvības iela 23 (BO11)*
- 7:00 і 9:30: Svētās Trijādības Pārdaugavas baznīca
  *Meža iela 2 (BO12)*
- 8:30: Svētā labticīgā lielkņaza Ņevas Aleksandra baznīca
  *Brīvības iela 56 (BO13)*
- 6:30 і 8:30: Rīgas Vissvētās Dievmātes Pasludināšanas baznīca
  *Gogoļa iela 9 (C014)*

**Пасілак разам з месцічамі. Калі ж вы закватараваныя ў месцы супольнага пражывання, праверце з каардынатарам месца з мясцовага прымаючага пункта, дзе вы можаце з’есці той пасілак.**

***Ад 16:00 да 18:00***

Ад’езд аўтобусаў. Месцы ад’ездаў адрозніваюцца ў залежнасці ад краіны.

- Беларусь
  *Arēna Rīga, Skanstes iela 21, паркоўка PA2, на гарадской мапе: a7*